Базыль Мялешка

Плямкі на паперках жыцьця



Менск 2011

Базыль Мялешка



ПЛЯМКІ НА ПАПЕРКАХ ЖЫЦЬЦЯ



Менск 2011



Я малады беларускі паэта. Нарадзіўся 1 студзеня 1990 году ў Менску. Да паэзіі прыйшоў у 18 год. У гэтай кнізе зьмешчаны творы напісаныя ў большасьці пасьля першага друку, які адбыўся 30 верасьня 2009 году ў ґазэце Наша Слова. Больш сур'ёзна нідзе пакуль не друкаваўся.

У зборніку выкарыстаны правапіс паводле пятага выданьня "Беларускай ґраматыкі для школ" (Вільня, 1929 г.) Бранісслава Тарашкевіча. Меў на мэце аформіць яго ў духу беларускамоўных кніг часоў ґазэты Наша Ніва (пачатак XX-га стагодзьдзя).

Папяровая вэрсія зроблена для родных, сяброў, блізкіх, добрых знаёмых. Канешне ж буду рады, калі яе возьме пачытаць невядомы мне чалавек. Гэта мой першы самавыдавецкі вопыт. Прыемнага Вам баўленьня часу з гэтай кніжкай.

Праца над кнігай: Базыль Мялешка.

~~~~~~

Аддадзена на друк 29.01.11 ў Менску ў выглядзе 35-ці экзэмпляраў.
~~~~~~







* * *

Вам прысьвячаю я, родныя людзі,
Гэтыя слоўцы, радочкі свае.
Хай на шляху вашым хораша будзе,
Хай вам нічога жыцьця ня псуе.




Гэтыя вершы хай сэрцайка грэюць,
Бо ў іх я душу і шчырасьць паклаў.
Хтосьці з вас скажа што стыль састарэлы,
Ўсё ж ткі ў мінулым паболей сьвятла.

Доўга спрачацца ды нават і біцца
Можна аб тым, як патрэбна пісаць,
Я ж маю думку, што той хто баіцца
Той і ня зможа сам праўды казаць.

Лепшае долі, здароў'я ды шчасьця
Я як магу вам хачу пажадаць.
Розум цьвярозы да ўсякага майце
І не страшыцеся больш працаваць.

ТРЫВОЖНЫЯ ПЛЯМКІ...




ЖЫВІ ДАЛЕЙ!

Жыві далей,
Хоць тысячу праблем
Ты маеш зараз за сьпіной.
Жыві далей!
Усё О'Кэй!
Працягвай сябра йсьці у бой!

Улетку краскі,
Увосень лісьце,
Узімку ў трасцы,
Увесну выйсьце.

Рабі удалы
Ўперад крок –
Удача прыйдзе
На парог.




КАЛІ Ў РОСПАЧЫ

Вось табе стала у стоме вядома:
Сьцежкай ты крочыш да шчасьця чужою,
Думкі твае ня ў суседстве нікому,
Сум авалодаў душою.

Сосны ўсё роўна у неба імкнуцца,
Хоць бура носіць іх, долу згінае.
Парасткам траўцы пад сілу прачнуцца
Нават дзе штось замінае...

Ўчуй жа сябе – тое ўсё пераверне.
Мабыць ты здольнасьці к іншаму маеш?
Справу жыцьця ты натрапіш, павер мне,
Толькі як гэтае сьцяміш.

Моцнымі крокамі рухайся ўперад,
Мэтаў сваіх дамагайся упарта,
Будзь летуценьнікам велькіх памераў,
Веру ня страчвай на заўтра!



ТОЛЬКІ ТЫ НЕ ЗАГАНЯЙСЯ...

Чарговы дзень падорыць мне адчай,
Але чаму? Нічога кепскага ж не адбылося...
Быць можа крыўдна зараз, выбачай,
Калі заплачу, глупствы мовячы, ў парадку зносін.

Напомніш мне што можна стаць другім,
А словы гэтыя чамусь маю душу зьняважаць.
Ды адкажу: стаміўся быць адным,
Цяпло шукаючы паўсюль, усюды столькі блажы,

Што проста дыхаць вольна не магу
І, шчыра кажучы, мне хочацца сысьці, памерці,
Пакінуць гэты сьвет, пайсьці ў смугу,
Суцішыць сэрца, я ня ведаю куды мне дзецца!

Дык што да гэтага так давяло?
Стаміўся можа? Ў нейкую дзяўчыну закахаўся?
Паслухай, прыйдзе сонейка цяпло,
Міне пахмурнасьць тая, толькі ты не заганяйся.



* * *

Здавён няма ўжо вакол
Тут звагі да сапраўдных ваякоў,
Затое многа ходзяць панямі і панічамі.
Гляджу ўвесь час на сваякоў,
Сяброў ды разнастайных мінакоў,
Народ з-за гэтага жыве з патухлымі вачамі.


Хто цень на край увесь наш напусьціў,
Што горы да зямлі заўсёды гнуцца
Ды іншым не даюць у небасхіл
Узьняцца кіраваць далей, прачнуцца?

У заняпадзе нацыі бядзе,
Ня зараз, дык праз нейкі час дакладна,
Той будзе вінаваты, хто спадзе,
На Бацькаўшчыну напляваўшы здрадна.

Няхай аднойчы едучы ў мэтро,
Пачуўшы зноўку абвяшчэньне станцый,
Ты сьцяміш тое й запульсуе кроў,
Наноў заставіўшы ў сабе капацца:



Навошта мы існуем на Зямлі?
Зьдзяйсьненьні нашы насамрэч патрэбны?
Нашчадкі нас захочуць пахваліць?
Старых ці ссохнуць Радаводаў дрэвы?





БОЛЬШ ПАЭТ НЕ АБАРОНЦА...

Зноўку вясна у Менск завітала,
Ветла стрэла люд аселы,
Лёсам здаўна што ужо закружлялы
На чужацкай каруселі.

Добра жыве ён, моцна кахае,
Зьмены йму наўрад патрэбны.
Сам ліхадзея стрывае, спаткае,
Трэба сіла – дасьць у рэбры.

Думка прыходзіць: а ты тут навошта?
Больш паэт ж не абаронца...
Словы любыя вырашаць грошы,
Дзе іх многа, там і сонца.



ПАЭТАМ...

Вы не павінны мірыцца з каханьнем
Што утвараецца зьменай абліччаў.
Вам быць патрэбна заўсёды ў змаганьні
З модным ґлямурам, што ганьбіць наш звычай.

Птушкаю вольнаю лётаць, няйначай,
Зрок мець найвостры, што зьвязаны з сэрцам.
Быць актуальнымі, не, дык няўдача,
Струнка душэўная ўміг надарвецца.

Многа ня значыць патрэбна камусьці,
Ўсім зразумела і прафэсійна.
Трэба вучыцца, ісьці да навуцы,
Моваў больш ведаць і ўсё не насільна.

Праца паэзія, плюс яшчэ талент,
Верце ў яго – тады ён і прыбудзе.
Розум з сумленьнем усякаму далі.
Біць проста так не патрэбна у грудзі.



БАЦЬКІ

У абставінах любых
Трэба паважаць бацькоў.
Маці колісь удваіх
З Бацькам паяднალі кроў

І прыйшоў на сьвет жа ты,
Зорка новая ўзыйшла,
Так што трэба ім заўжды
Дзякаваць старацца шмат.

Сваркі бойкі зноўку, хай –
Глуптсвы месьцяцца ва ўсіх.
Ўсё ж вытокі ня губляй –
Гэта грэх, дабро нясі.

Дрэва роду ёсьць адно –
Сук ягоны не ламай.
Помніісьцінаў сьвятло
І наўвеце іх трымай.



* * *

Турэччына улетку,
Гатэль зь бясконцымі ласункамі,
Эґейскае ўзьбярэжжа.
Што можа лепей быць для беларускага хлапца
Ці да якой належыць ён сям'і?
Тут з дрэў сьвісаюць кветкі,
Брыз лісьце пальм калыша гнуткае...
Інакш у нашых межах,
Бо дождж крапае ўсяго чатыры месяцы,
А сонца іншыя пануе дні.

Адсюль і нявыносная сьпякота грэе горы,
Якія крытыя аліўкамі
Ды шмат у касякі зьбіраецца у цёплым моры
Істотаў, што завуцца рыбкамі.

Ёсьць помнікі антычнай Грэцыі, эпохі Рыма.
Чуваць гісторыі тут водгульле...
Убачыўшы Эфэс стары пасьля візітаў Крыма,
Зьдзівіўся я: хто ж мы увогуле?



Нямала там чаму ня дрэнна ўсім нам павучыцца,
Напрыклад як спачынак робіцца.
Да іх з усіх краінаў сьвету едуць палячыцца,
Бо бачна і сьляпому розьніца.

Да што і мовіць дыхае турэцкі люд свабодай,
Ў адрозьненьні ад нашай роспачы.
Ён не чакае часу лепшага да спраў, пагоды,
А йдзе далей, ня ўзяўшы помачы.

Па шчырасьці шкада мне стала
Бацькаўшчыну нашу,
Калі убачыў больш прыгожае,
Але я веру што на ўсе пытаньні мы адкажам,
Што пераможам мы нягожае.

Кушадасы.



КРАІНА-СУСЕДКА, ЧАМУ?

Украіна,
Ты суседка маёю Краіны,
Адкажы, чаму мы на хвіліну
Бярэм толькі сваё ужываць?

Малайчына,
Можа нам не здаецца мажлівым
Хоць як ты усе жахі адкінуць,
Усьвядоміць сябе, адшукаць?

Немагчыма!
Нам прыкідвацца здовен чужымі!
Ўсё хавацца у бульбе глухімі!
І бясконца чагосьці чакаць!

Крым, Міжводнае.



* * *

Радзіму любі! Шчырым будзь патрыётам!
Вось толькі адкрыта, ня трэба употай,
Хай нехта там лічыць што мы ідыёты,
Такія яны, бо ў пустэчу упёртыя!


Ня слухай ты іх, імі дурань кіруе,
Ім розуму гэта даўмецца бракуе,
Сам верай жыві, а жыцьцё ты ўладкуеш,
Бо дзела ты ведаеш, праўду шануеш.

Гаворкі вядзі на сваёй роднай мове,
Ўжывай і тады калі рускае слова,
Ня стане вакол цябе дрэнных размоваў,
Усім толькі гонар, павага высновай.

Усё будзе добра! Іначай ня з намі!
Вырошчвай дзяцей, спрачайся з бацькамі.
Хай беды былі ды здароў'е забралі,
Каб скарбы заставіць, працуй і надалей!



Нам сонейка й месячык Сьцягам у небе,
Блакіт і ўсе зоркі Пагоняю гербам,
А дожджык, сябрук іх, заўжды па патрэбе
Напоіць зямлю і народзіцца хлебам.





* * *

Кожны пакідае плямкі у жыцьці
На сваіх паперках - днях, што вельмі хутка йдуць.
Дык няхай жа колер іхні зіхаціць,
А ня шэрым, чорным будзе, йкі нясе бяду.

Скажаце вы мне што я ідэаліст.
Згодны, ня бывае так што хораша заўжды.
Добра, гляньце неяк на вясновы ліст,
Ён бляднее толькі як ідуць яго гады.

Тое самае і з чалавекам тым:
Ўсё ў яго псуецца з часам, робіцца ня так.
Гэта трэба сьцяміць мужна і затым
Падзяляць дзе ёсьць вясёлка, а дзе цемната.



ПАВАЖАЙЦЕ СПРАВАЙ БЕЛАРУСКУЮ КУЛЬТУРУ!

Хто з Вас быў нядаўнім часам
У музэі ці чытаў сваю літаратуру?
Вымаўляю ўсім наказам:
Паважайце справай беларускую культуру!

Дзе музыкі, дзе ў нас барды?
Тыя дзе што вушы нашы мучаюць халтурай?
Вымаўляю ўсім загадам:
Паважайце справай беларускую культуру!

Дзе кіно ў нас, дзе тэатры?
Што ў нас ёсьць з карцін падобна
Трэцьякоўцы, Луўру?
Вымаўляю ўсім упарта:
Паважайце справай беларускую культуру!



* * *

Радуйся, сьмейся і гэта галоўнае,
Ня трэба быць спорчанай зь плесеньню сьліваю.
Зь людам стасункі павінны быць роўныя,
А ня злыя, з чужым недаверам, хлусьлівыя.

Проста утворана, значыць і зь вернасьцю,
Паўсюль такі прынцып, узгадвай ты гэтае.
Шчырасьць адданая большаю вернецца,
Дык топай ты толькі сьцяжынкаю сьветлаю.

Жарты жыцейскія самыя лепшыя,
Навошта змагацца за вынаходніка?
Проста дзяліся пачуцьцямі, рэчамі,
Падумай, мажліва зьяўляесься шкоднікам?

Вартае ўсё не ўсягды ідэальнае,
У крайнасьці кідацца гэта апошняе.
Не забывай жа каноны маральныя,
Сьвятыя высновы заўсёды найноўшыя.





* * *

Чалавек сапраўды чалавек,
Калі шчасьцем гарацьь яго вочы,
А гарацьь яны там дзе адвек
Ён свабодна ў жыцьці сваім крочыць.




Дзе зь ім лічацца, разам ідуць,
Памагаюць, калі ёсьць патрэба.
Не, хаваючы праўду, ілгуць,
А гавораць празрыста як трэба.

Мой народ мае звычку цярпець,
Йму спрадвечна прывілася мудрасьць,
Ня прывык ён трымацца ледзь-ледзь
І адказваць увагай на дурасьць.

Штостагодзьдзе трымае прыгнёт,
Бо палёг ён на мапе выгодна,
Мае мову, меў воляў палёт,
Яго мара ўвесь час быць свабодным.

СЬВЕТЛЫЯ ПЛЯМКІ...




* * *

Н.К.

Ў сэрцы ўзьнімалася сьвежая краска,
Як заглядацца пачаў я ў твой бок.
Цьвісьці каханьнем дзівосным зьнянацку
Ўзяўся яе бадылёк.

Стаў я цягнуцца ў нябесныя высі
Каб да тваёй дакрануцца расы.
Рос вінаградам, лазою завіўся,
Нібы твае валасы.

Думаю зараз: табе ці патрэбны?
Схільны да думкі - напэўна што не,
Бо не займеў я ні золата й срэбра,
Бо я дурнога дурней.

Хай дажывае свой век тая кветка,
С часам пачуцьці у попел сыйдуць.
Стрэну цябе як ты будзеш кабетай,
Гэта ты зможаш пачуць.



У АЛЯКСАНДРАЎСКІМ СКВЭРЫ...

Хоць столькі бруду ўсякага і недакуркаў,
З душою ў раньнюю вясну прыйду,
Там дзе нядаўна панавалі холаду вятры.
Ї тут, каля старых дамоў цэнтральных вулкаў,
Сабе я сесьці месцайка знайду,
Убачу, побач горак сьнегу, раўчукі вады,
Зь іх хвалісты блакіт напрошваецца у сябры.

Праменьні парыжэлага сьвяціла,
Што дрэвы голыя азалацілі,
Згасаюць на бялюткіх сьценах,
Сьцішаюць пульс у маіх венах.

Чутно як гарлапаняць крумкачы,
Па плітцы люд мінае помнікі ды лаўкі,
Дзе, гледзячы на іх ці ў далячынь,
Раблю асадкаю ў нататніку папраўкі.

Падмерзлы ўжо і не магу дазнацца,
Што у душы бытуе сяньня:
Ці тое крыўда мкне мяне злавацца,
Ці тое паўстае каханьне...



* * *

Стаміўшыся ад шумнае сталіцы,
Пад Магілёвам апынуся ў карагодзе
Прыроды дзіўнай нашай, што ня сьніцца,
І стану сам з сабой у неймавернай згодзе.


Там лецішча стаіць маёй бабулі,
Якое пекна даглядаюць цёця й дзядзя
Ды стане добра так чамусьці, ўтульна
Ад простых словаў іхніх, рэчаў даўніх зьзяньня.

Ля возера палёг лясок старэнькі,
У ім як раньш свае адбіткі разглядае,
Пазнаўшы скажа: помніш ты маленькім
На "Бусьліку" катаўся? Весну нагадае.

Ўсё тая ж фарба на дамах суседскіх,
Ў кагосьці зь іх ужо гарод у пустазельлі.
Здаецца дзеці ўсе сыйшлі да Менску,
А помню як агульныя хвіліны мелі.



Традыцыі і мову забываем,
Бо горад і праґрэс трымае у палоне.
Давайце ва ўспамінах пабываем
Ды кожныя наведаем былыя ўлоньні.






СОНЕЙКА

Золатам зь неба зьзяе талерка,
Піша ўсім сьпёкі радкі.
З брамы аблокаў – бяліла заліўкаў,
Промняў пускае слупкі.

Дзеля ня толькі у цень схавацца,
Выпіць халоднай вады,
А каб няспынна у жыцьці разьвівацца,
Ўперад ісьці, дагары.





* * *


Звон, ці не? – каля вакна ў маім пакоі
Лямпа патаемна надае на слых?
Ці быць можа так зазвоняць дзесь у полі
Конікі, калі я буду не ў спакоі,
Дзе з каханаю стаюся удваіх?

Ў той час мроі ажывуць,
займее сэрца дзіўны голас,
Зь ёй захочацца застацца назаўсёды там,
Паяднацца з зорнымі нябёсамі уголас,
Ўзяць пацерабіць жытнёвы колас
Ды пакінуць нахіляцца ўсім вятрам.

Ноччу месяц нам асьветліць сьцежкі,
Што засланыя усе у пыльных дыванох,
На якіх каменьчыкі бы як гарэшкі,
Дзе штодзённа блікі робяць перабежкі,
Плыўна працякаюць па краёх.



Зранку запяюць чароўна птушкі,
На зямлі мы знойдзем іх сьляды.
Сеўшы побач, як зручней наставім вушкі,
Каб паслухаць іхнюю дрындушку,
І ўсьміхацца будзем як заўжды.





ЗАЛЕСЬСЕ

Майму першаадкрывальніку лазапляценьня,
Іванову Аркадзю Міхайлавічу.

На той бераг абрывісты Віліі
Прывядзе лазаплёт мяне, ў люстры вады
Я убачу нябёсы маўклівыя,
Што вятрыскі хвалююць заўжды.

Тут рыбінкі ўсё дно ужо зьведалі
І ўсплываючы раптам малююць кругі.
Кожны ранак пні вільгацьцю сьнедаюць,
Дажываюць свой век ці другі.

Закувае зязюля адрывіста,
Качак воплескаў крылаў народзіцца гук,
Шыі лебедзі гордыя выставяць
І мы станемся лішнімі тут.

Недалёка памесьце Агінскага.
Мэмуары свае тут пачаў ён складаць,
Ўзяўшы дзёньнікі ўсе зь перапіскаю,
А ў Флярэнцыі змог перадаць.



Ды папрок той узбудзіцца ў сэрцайку:
- Пан Акрадзь, вось бы любая побач была...
- Дык чаго ж не пазваў? Гэта месцайка
Дзе б ты зьнічак ёй кошык спаймаў...





НОЧ ВА ЎРУЧЧЫ

Квітнее красавік і ня зьлічыць галін,
Якіх узьняўся водар смачны позна.
Маўклівы лес, што за вакном заснуў маім
Ужо прывык да гарадскіх пагрозаў.


Зноў змрок, уверсе зоркі зь месяцам вісяць,
Апусташаюць прочкі дур у думках.
На іх, калі ў адчаі, добра пазіраць,
Шукаць ад мітусеньня паратунку.

Уручча ўжо заціхла, шэрыя дамы,
Падсьветленыя толькі ліхтарамі,
Стаяць шырокія, забітыя людзьмі,
Наўрад ці йкія штось пераўтвараюць.

Раптоўны гоман моцнага таварняка,
Што побач рэжа сьвежае паветра,
Жаданьне ўзбудзіць стаць абліччам жаўрука,
Пець песьні ўранку пад парывы ветра.



Ішлі і йдуць дзівосныя жыцьця гады...
Люблю ўноч больш я гэту кропку Менску.
Ды хочацца з каханаю, падчас хады,
Сьвітанак стрэць, успомніць зноў маленства.





ЗДАРОЎ'Е ПАДЫМУ...

У маім жыцьці адбыўся важны цуд –
Меней есьці ўзяўся, перастаў фаст-фуд.
Піва і сьпіртное скончыў піць удоваль,
Бо дурная справа – я зрабіў выснову.
Мэтад вынайшаў як перастаць паліць,
Кінуў – стала лепей дыхаць ды і жыць.
Маю мэту зьлёгку абрабіць характар,
Так як кажуць месцамі неадыкватны.

Фізкультура, кнігі, трынажоры,
плаваньне – здароў'е падыму...
Добра ўсё ідзе, але
Смутак паўстае ў мяне
І пытаньне як заўжды у
безнадзейнасьці паставіў я – чаму?

Доўга ўсюль блукаўшы высьвятляў адказ,
Так шукаў што ўсё ж, падаўся на паказ:
Засталося дрэнь прыбраць у галаве
Ды трымацца гэтак проста для сябе.



* * *

Падае сьнег на мой парог,
Болей відаць бляск сьняжынак
Ля ліхтара, што ноччу змог
Быць, хоць мароз, сьветлым джынам.


Добрым, які праменьні зноў
Кідае ў сьвет што ёсьць моцы,
Не дапушчае лішніх слоў,
Робіць усім справу сонца.

Слаўнае сьвята Новы Год,
Сыпяцца ўсюль віншаваньні,
Дзеці закружаць карагод,
Зьнікнуць на міг спрэчкі, званьні.

Дзень нараджэньня шчэ раз мой
Я адзначаць буду дома.
Будзе зь сябрамі шмат размоў,
Пойдзем гуляць аж да стомы.



Хай усяплякі б меў жыцьцё
Сьветлае, дзе ўсё ты можаш.
Грошы былі ды ў забыцьцё
З думак сыйшоў боль варожы.





ГЛЯНЬ НА НЕБА...

Глянь на неба, што моўчкі пяе,
Моўчкі кліча ў абдымкі свае,
Асабліва ў цёплыя дні,
Там дзесь сонца хавае вагні.

Там зьяўляецца зьніч нечакана,
Утварае сузор'і ў спатканьні
З морам зорак, што дробна мігцяць,
Як блакіту ўжо ня відаць.

Пах кастра ці кастрыцы ў паветры?
Не бярэ з нас грашовых манэтаў
За сваю непаўторную моц,
Яе дорыць бясконца ноч.

Не палохае ветрык трывогай,
Гоніць хмару паціху дарогай,
Дзе дзівосы шматлікія ёсьць,
Каб усім падарыць прыгажосьць...



ЧАКАЕ ВЫЗВАЛЕНЬНЯ?

Вунь дзеці запускаюць зьмеяў:
Адно дзяўчо ружовы мае,
Другая - сьветла-жоўты,
Чакаюць на гары павеваў,
Каб паказаць як лёгка ў траўні
Ўзьняць іх на палёты.

Прыемна быць кіраўніком
Вялікай птушкі яркага,
Кіслотнага адценьня,
Якая ўсім сваім нутром
Жадае найхутчэйшага
Ад цягі вызваленьня.



НА ВЫСЬ...

Белыя горкі прыгожых аблокаў...
Бачны нам толькі іх ніз...
Птушкі лятуць і лунаюць высока,
Сесьці жадаюць на высь.


Каб адпачыла чырвоная кроў
Сэрцайкаў бойкіх заўжды,
Каб жартаваць, пасьмяяцца наноў
З той мітусьлівай зямлі...

Дзе яны вырасьлі, дзе гадаваліся
Маці й татам між траваў гаючых...
Дзе сустракаліся зь едкай нянавісьцю,
Зайздрасьць пазналі ліпучую...

Ім не патрэбна зьнявагі цярпець,
Могуць і хочуць усім
Несьці дабро і мажлівасьць квітнець,
Толькі тут іх ня чуюць зусім...



Хопіць! Зьлятайце з маёй Беларусі!
Вершнік пакажа дарогу...
Можа вас прышласьць вярнуцца прымусіць?
Прышласьць, як шанец народу...







МЕСЯЦ ЗЬДЗІЎЛЯЕ...

Супрацівіцца чорнай цямноце
Тонкі месяц – ліхтар уначы.
Сам зьяўляецца ў небе дзе хоча,
Каб за зоркамі пільна сачыць.




Ён іх беліць сівым серабром,
А ўніз проста так не глядзіць:
Па-на хмарах бразґоча сьвятлом,
Быцца чысьценькім срэбрам зьвініць...

Можа нам, хто ў прагноцьці на грошы
Робіць зманы, бязглуздныя рэчы.
Хто са шляху сумленьня ўжо збочыў
І гібее ў духоўнай пустэчы...

Нам, хто мае ўсяго што патрэбу,
Хоць як-небудзь пабыць на плаву,
Месяц срэбрам пазвоньвае зь неба,
Каб мы ўзьнялі туды галаву.

ПЯВУЧЫЯ ПЛЯМКІ...




ЗАВІС

Зараз дарагі мінае час,
А я завіс на ёй
І ціхі шэпт душы маёй
Спрабуе вынайсьці адказ.

Навошта мне яна
Залезла ў галаву?
Бо й выпадку няма
Мае мне справы адмахнуць...

Ці можа гэта
толькі зіма
Нас лезе
аб’яднаць,
Хаця б праз вочы
ды інтэрнэт,
Празь непатрэбнасьць?

Патрэбна жыць далей,
Але штоноч яе
Я бачу ў крэпкім сьне
Крыху падобнай на мяне.



Ва ўсім яна свая,
Як быць належна ёй,
Прыгожая уся,
Задаволена сабой.

Ці можа гэта толькі зіма...

Калі побач ейны твар
Мне дорыць ветлы скарб
Я ўжо не гаспадар
Над моцай сваіх мар.

Я буду вандраваць
Па цемрадзі дарог,
Прыемна выдумляць
Што дзесь яна тут ё.



НОВЫ ДЗЕНЬ

Пасьля бяссоннай ночы
Сустрэну ранак я.
Ня трэба плюшчыць вочы –
Вакол вясны пара.

Я сонца ўбачу кветку,
Як толькі зноўку зацьвіце.
Грамадзянін сусьвету
Прыйшоў тут да цябе.

І гэта новы дзень!
Што можа быць найпрыгажэй?
Чутно птушыны сьпеў,
ён падбадзёрвае да дзей.

І гэта новы дзень!
Што можа быць найпрыгажэй?
Чутно птушыны сьпеў,
які бадзёрыць зноў да дзей.



Вось новая падзея:
Я стаў дзіцёнкам у душы.
Няхай жыве надзея
Сваю каб справу варушыць.

Хай ганарацца мною
Мае ўсе побач сваякі,
Бо я з самім сабою
Умацаваў шляхі.

І гэта новы дзень...

І гэта новы дзень...

Хай ноч мая пачнецца позна
І прападзе палова дня,
За то мой сьветапогляд сёньня
Кранула чысьціня.

Узяў пачатак новы дзень,
З усімі не аднолькавы,
А многія, амаль усе,
Цудоўнае прахлопалі.



ВЕДАЕШ...

Заляціць туды цудоўны птах,
Там дзе я спаткаюся з табой.
Я знайду ў тваіх, а ты ў маіх вачах
Калыханьне крыл яго.

Можа збудзецца яднаньне мар,
Гукаў кожных нашых слоў.
Зразумею раптам што ты super star
На асфальце сьцежак гарадоў.

Ведаеш,
патрэбна мне ты
больш чым хто.
я безь цябе ніхто,
без усяго твайго.

Ведаеш...

Напачатку, як цябе сустрэў,
Штосьці разгарэлася ў душы.
Захацеў я быць вышэй за дрэў,
За дамы, за аблачын.



Свае вочы паказала мне
Нечакана так каб зачапіць?
Тварык нахіліла ўбок так ветліва -
Цяжка здагадаўся што рабіць!

Я чакаю цябе,
я кахаю цябе,
я згубіў цьвярозыя мазґі.

Я увесь у сьне,
я нічога ня ем,
я здаўна ня быў, ня быў такім.

Я чакаю цябе...

Я увесь у сьне...

Не заўважыў нават як ужо ў ярме.
Сябра, кіне - падтрымай!
Вугаль сэрцайка каб дагарэў
Полымя ты падзьдзімай.

Я чакаю цябе...

Я увесь у сьне...



ПАД ТВОЙ НАСТРОЙ...

Пад твой настрой,
Хіба ты марыш,
Амаль насёньня неба строй
Заткалі хмары.

Дажджлівы вечаровы пах
Прыходзіцца табе.
Мы нават дойдзем не пад дах –
Няхай цячэ па галаве.

Малыя побач дзеці,
Каля зьліўной трубы,
З пакінутага сьмецьця
Запускаюць караблі.

Што будзе новым заўтра?
Адбітак неба у вадзе?
Напэўна тая ляжа карта,
Якую ведаем цяпер.



Што будзе новым заўтра?
Адбітак неба у вадзе?
Напэўна тая ляжа карта,
Якой ня ведаем цяпер.

КАЛЫХАНКА ДЛЯ ІЛЬЛІ

Пляменьніку.

Засынай Ільля,
Уяві каня,
Што памчыць цябе праз жыцьцё.
Зоркі сьвецяць здаля,
Іх табе ўсталяваў
Месяц – зьдзейсьніў сваё адкрыцьцё.



Хмаркі доўгія сьпяць,
Сны прыгожыя сьняць,
Лес таксама пайшоў у спакой.
Дык ня трэба крычаць,
Трэба адпачываць,
Тата й мама тут будуць з табой.

Мілае дзіцятка,
У калысачцы змоўкшы,
Будзе як зярнятка
У сланечніку жоўтым.

Вырастай магутным
Вольным арлянём
І лунай над квітнеючай рутай,
Абміні палон.



НІХТО ВАС НЯ ЎКУСІЦЬ

Жыхары ужываюць
родную мову,
любоў праяўляюць
да Беларусі,

дык будзьце Вы зь імі,
ня трэба баяцца,
за простыя словы
ніводны ня ўкусіць.

Як добра адчыніць
Стары слоўнік,
Увагу завастрыць
На скарбах моўных

Ці пачытаць
Пісьменьнікаў розных,
У сшытак запісаць
Занадта што сур’ёзна.



Яны ёсьць, іх ня трэба шукаць,
Хто размаўляе па-беларуску,
Проста ты павінен пачаць,
Хай будзеш гаварыць нейкія глупствы.

Ня спыняйся ды слухай мову,
Палюбі куточкам сэрца,
Потым сам зробіш сабе выснову:
Маім сябрам стаў тутэйшы вецер.

Жыхары ужываюць...

дык будзьце Вы зь імі...

Гэта файна пачуць
Родныя слоўцы
Сярод чужакоў
На жывой гаворцы.

Адкажаш, усе будуць
Больш паважаць,
Не забудуць,
Ня стануць зьневажаць.



ТЫ НЕ ДАРМА ЗЬДЗЯСЬНЯЕШ КРОК


Лета раптам зьнікла,
І так нязвыкла,
Дрэвы зноў даюць цябе прыклад,
Як кідаюць лісьце –
Трэба не баяцца зьменаў,
Шукаць выйсьце,
Як бы там ня было,
Рухацца наперад.
Ня трэба ўсё ж ткі заліваць праблемы півам,
Мажліва й безь яго
Асабліва шчыра
Пагутарыць зь сябрамі,
Знайсьці іншы погляд
Ды пагуляць,
Хоць на двары кастрычнік, холад.

Апошняя зялёная трава каля парога
падміргвае мне разьвітальным вокам,
на сэрцы не пайму: ці сум ці то трывога,
але я разумею – не дарма зьдзяйсьняю крокі.






Халодны ветрык ахіне мяне знарок,
падтрымае, калі няма сяброў,
ён скажа: ты не дарма зьдзяйсьняеш крок,
у цябе яшчэ цячэ жывая кроў.

Восень? Губляеш добры настрой?
Сон шукаеш? Шукаеш спакой?
Ёсьць праца? Ня трэба здавацца!
Ці вучоба? Не прапусьці нічога!
Змагайся, ідзі па гэтым жыцьці
І атрымай тыя абшары, аб якіх ты марыш,
Ўсё на добрае творыцца, як ні круці,
Гартай старонкі часу з усьмешкай на твары.
Хай навальніца бушуе і йдзе вялікі дождж,
Ты сам прыкінь, чаго ж? Трэба падаць духам
І апускацца на дно?
Тым больш сёрбаць нейкае таннае віно?








ЗЬМЕСТ









СЬВЕТЛЫЯ ПЛЯМКІ...





ПЯВУЧЫЯ ПЛЯМКІ...





КАНТАКТЫ:

e-mail: vasil.mialeshka@tut.by
http://bazyl-mialeszka.livejournal.com/
http://vkontakte.ru/id20054522
Skype: bazyl.mialeszka

